■ Армія

# «РУКІ ПАМЯТАЮЦЬ!»



## Ва Узброеных Сілах Беларусі працягваецца праверка баявой гатоўнасці

**ЯНА праводзіцца Дзяржаўным сакратарыятам Савета Бяспекі па даручэнні Прэзідэнта. Нагадаем, што каля 2 тысяч ваеннаабавязаных грамадзян Беларусі адправіліся на зборы ў адно са злучэнняў Барысаўскага гарнізона. Карэспандэнты «Звязды» наведаліся туды і паглядзелі на свае вочы, як салдаты, сяржанты і афіцэры рыхтаваліся да правядзення маршу на 227-ы агульнавайсковы палігон.**

Сваю работу разгарнуў перасоўны інфармацыйны цэнтр. Фактычна гэта — сучасная рэдакцыя, якая можа вельмі хутка перадыслакавацца ў любы пункт.

— Тут мы робім мантаж відэаролікаў, вярстаем і друкуем плакаты і штодзённую двухпалосную газету «Гвардзейская праўда», — кажа начальнік **інфармацыйнага цэнтра Аляксандр УЛАСКІН.** — І ўсё гэта сіламі чатырох чалавек! Тыраж — ад 50 да 100 экзэмпляраў. Яна карыстаецца вялікім попытам. Мы раздаём газету па падраздзяленнях.

Тое, што ў іх адбываецца, і становіцца тэматыкай публікацый. Гэта заняткі, вучоба, работа на тэхніцы, стрэльбы... Але большасць публікацый прысвечана людзям. Усё-такі цікава ж ведаць, з кім ты выконваеш баявыя задачы на працягу месяца. І самі прызваныя цікавяцца, што ж адбываецца ў іншых падраздзяленнях. Псіхалагічны настрой — вельмі важны складнік.

— Павестка прыйшла нечакана, — кажа **старшы афіцэр, старшы лейтэнант запасу Аляксандр КАВАЛЕЎСКІ.** — Першыя зборы былі даўно, пасля ўніверсітэта і ваеннай кафедры. Гэта каля двух дзясяткаў гадоў таму. Але асабіста для мяне перастроіцца на вайсковы лад было лёгка. Я захапляюся паляваннем, рыбалкай, паходамі. Таму жыць у экстрэмальных умовах і абыходзіцца са зброяй для мяне не ў навінку. Штодня стэлефаноўваюся з сям'ёй, таму «адарваным» ад грамадства сябе не адчуваю.

«Цвіком» нумара, які рыхтаваўся пры нашым наведванні, стала зняцце баявой тэхнікі з захоўвання, падрыхтоўка асабовага складу да выхаду ў раён сканцэнтравання і здзяйснення маршу. У гатоўнасці нумар адзін — і медыкі. Перад пастраеннем і інструктажом паспяваем пагутарыць з **лейтэнантам медыцынскай службы запасу Ільёй ВАРАБ'ЁВЫМ.** Яшчэ нядаўна ён працаваў урачом-хірургам 9-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска. Дома яго чакаюць жонка і малое дзіця.

— Гэта мае першыя зборы, хоць мне і трыццаць гадоў. Па ваенна-ўліковай спецыяльнасці я старшы ардынатар хірургічнага аддзялення асобнага медыцынскага атрада. Гэтыя навыкі пакуль што выкарыстоўваць не даводзілася.

Апошнія прыгатаванні да выхаду ў раён сканцэнтравання — і ў танкістаў. Байцы аглядаюць тэхніку, правяраюць яе на спраўнасць. Да нас спускаецца **камандзір танка Вадзім ПІСЬМЯНКОЎ.**

— За плячыма ў мяне служба ў войску. Я быў наводчыкам танка. А цяпер вось стаў камандзірам. Адказнасці стала больш — трэба арганізаваць зладжаную работу ўсяго экіпажа. Тры гады і чатыры месяцы прайшло ад часу дэмабілізацыі, як я зноў апрануў форму і шлем. Адзінае што — цяжкавата прывыкнуць да абстаноўкі, хоць я тут і дзесяць дзён ужо. Усё-такі прафесія ў мяне не зусім ваенная — я займаюся ўстаноўкай ахоўнай сігналізацыі.



Заканчваюць падрыхтоўку і спецыялісты проціпаветранай абароны. Ім давядзецца перамяшчацца на зенітным ракетна-пушачным комплексе «Тунгуска». Пасля выстройвання паходнай калоны іх чакае марш на палігон. Экіпажам камандуе **старшы сяржант запасу Павел ПРУДНІК.**

— За дваццаць гадоў, якія прайшлі з часу службы ў войску, мяне на зборы не прызывалі. Але адметна, што і ў 90-я я служыў на гэтай жа тэхніцы. Таму пытанне проста ў тым, што трэба ўсё ўспомніць як мага хутчэй. Гэта ж як на веласіпедзе — хоць ты не катаўся доўгі час, але, як кажуць, «рукі памятаюць». Экіпаж, у якім 4 чалавекі — я, механік, наводчык і старшы аператар, — у нас вельмі сяброўскі, мы «скантачыліся» літаральна за некалькі гадзін. Тым больш што нас адразу і размеркавалі па экіпажах. За дваццаць гадоў харчаванне палепшылася значна. Таму жонка не скажа, што я схуднеў *(смяецца).*

А непасрэдна на 227-м агульнавайсковым палігоне разгарнуўся асобны медыцынскі атрад. Яго складаюць больш за 40 жанчын з ліку ваеннаслужачых запасу. Ён прызначаны для медыцынскага забеспячэння ваеннаабавязаных падчас палявога выхаду.

А пакуль што дзяўчаты абжываюць палаткі. Яны носяць дровы, ствараюць утульную абстаноўку ўнутры часовага жытла на два тыдні. Але займаюцца яны ў грамадзянскім жыцці не толькі лекаваннем хворых. Напрыклад, **медсястра Кацярына ГУРЫНОВІЧ** вельмі трапна страляе, як з пнеўматычнай зброі, так і з пісталета Макарава.



**❍ У тэму**

**Палкоўнік Сяргей ВАЛЬКО, намеснік начальніка ўпраўлення эксплуатацыі, рамонту, узбраення, ваеннай тэхнікі Узброеных Сіл:**

— Бранятэхніка ваеннаабавязанымі знята з захоўвання. На яе ўжо пастаўлены кулямёты, загружаны матэрыяльныя сродкі. Аўтамабільныя падраздзяленні адбылі ў раён сканцэнтравання. На наступны дзень калона здзейсніць марш да 227-га палігона. Там мы правядзём стрэльбы і праверым гатоўнасць да далейшага выканання задач.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**

■ Надвор'е

# ПРЫГРЭЕ НА ЎСЮ МОЦ

## Сіноптыкі абяцаюць у чацвер да 20 цяпла

**У сярэдзіне бягучага тыдня ў нашу краіну прыйдзе цёплае вясновае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень у вобласці павышанага ціску будзе пераважна без ападкаў, толькі ў паўночна-заходніх раёнах пад уплывам франтальнага падзелу пройдуць дажджы. Тэмпература паветра складзе ад плюс 4 да плюс 10 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны тэмпература павысіцца да 11—14 цяпла. У сераду пад уплывам атмасфернага фронту ўначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень па паўночным усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. У асобных раёнах чакаецца туман, уначы па паўночным усходзе магчымы слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень чакаецца ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны — да 16—18 цяпла.

Істотна цяплець пачне з чацвярга, калі ўмовы надвор'я будзе вызначаць цёплая паветраная маса з паўднёвага захаду Еўропы. У асобных раёнах краіны не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў, а ноччу месцамі магчымы слабы туман. Замаразкі ўвогуле знікнуць, нават уначы. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 цяпла, удзень прагназуецца ад плюс 11 да плюс 17 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 19 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу ўначы ў асобных раёнах, а удзень па ўплывам атмасфернага фронту на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—10 цяпла, удзень чакаецца ад плюс 11 градусаў да плюс 17 градусаў, па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да 19 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

# ШАХ І МАТ!

**Сямігадовы беларус стаў пераможцам Нацыянальнага чэмпіянату Амерыкі па шахматах.**



У ЗША **сям'я ГРЫНЬКО** пераехала зусім нядаўна — у жніўні мінулага года. Бацьку Ягора перавялі з Гомеля ў іншае падраздзяленне IT-кампаніі. На радзіме хлапчук пачаў займацца шахматамі па ініцыятыве мамы Таццяны, якая і навучыла Ягора правілам гульні. Даволі хутка малы абыграў маму, таму бацькі вырашылі аддаць дзіця ў спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую школу алімпійскага рэзерву № 3 па шахматах. Там ён займаўся пад кіраўніцтвам трэнера-выкладчыка школы Марыны Церашковай, якая пасадзейнічала яго першым перамогам у розных спаборніцтвах.

**Вядучы рэферэнт упраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама Алеся РАШАНОК** расказала, што дзякуючы настойлівасці бацькоў і цязе самога хлопчыка да шахмат заняткі ў ЗША працягваліся самастойна: малы вырашаў да 30 шахматных задач у дзень:

— Цяпер сям'я Грынько жыве ў штаце Каліфорнія, які з'яўляецца адным з самых дарагіх у ЗША. Дарэчы, адны заняткі з персанальным трэнерам там каштуюць $55 у гадзіну. Бацькі Ягора знайшлі іншае выйсце. Ён стаў праходзіць анлайн-курс расійскага трэнера па шахматах. За паўгода хлопчык палепшыў вынік і паспеў паўдзельнічаць у 12 турнірах. У мясцовых спаборніцтвах па шахматах, якія праходзілі ў гарадах Куперціна, Фрымонт і Сан-Рамон, Ягор заняў тры першыя і адно другое месца. Між тым нацыянальныя чэмпіянаты ў ЗША праходзяць два разы на год, іх удзельнікі гуляюць толькі ў сваёй узроставай катэгорыі.

І вось неўзабаве сямігадовы шахматыст на Нацыянальным юнацкім шахматным кангрэсе (National Junior Chess Congress), які праходзіў з 10 па 11 сакавіка, заняў першае месца. Ён набраў 4,5 з 5 балаў і абыграў 22 удзельнікаў сваёй узроставай катэгорыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**